# ЗЯРНЯТКА 5

30 верасня 2018 г. XXVI Звычайная нядзеля, Год B

*Хто не супраць нас, той з намі. Калі спакушае цябе рука твая, адсячы яе* *Мк 9, 38–43. 45. 47–48*

Ян сказаў Езусу: Настаўнік, мы бачылі чалавека, які ў імя Тваё выганяў злых духаў, і забаранялі яму, бо не хадзіў з намі.

Езус жа сказаў: Не забараняйце яму, бо ніхто, хто ўчыніў цуд у Маё імя, не зможа адразу пачаць зласловіць Мяне. Бо хто не супраць нас, той з намі. І хто напоіць вас кубкам вады ў імя таго, што вы Хрыстовыя, сапраўды кажу вам, не страціць сваёй узнагароды.



А хто спакусіць аднаго з малых гэтых, якія вераць у Мяне, таму лепш было б, каб павесілі яму на шыю млынавы камень і кінулі яго ў мора.

Калі спакушае цябе рука твая, адсячы яе. Лепш табе калекаю ўвайсці ў жыццё, чым з дзьвюма рукамі ісці ў геену, у агонь непагасны. І калі нага твая цябе спакушае, адсячы яе. Лепш табе ўвайсці ў жыццё кульгавым, чым з дзьвюма нагамі быць кінутым у геену. І калі вока тваё цябе спакушае, вырві яго. Лепш табе з адным вокам увайсці ў Валадарства Божае, чым, маючы два вокі, быць кінутым у геену, дзе чарвяк іх не памірае і агонь не гасне.

*Гэта слова Пана.*

**Загады Пана справядлівыя і радуюць сэрца.**

## Бог даў Майсею 10 Запаведзяў. Знайдзі на малюнку схаваныя лічбы ад 1 да 10.



Апостальскае заданне на ўвесь тыдзень:

1. Маліся за ўсіх людзей, якія робяць дабро ў імя Езуса, каб яны ўмелі супрацоўнічаць паміж сабою і падтрымліваць адзін аднаго.
2. Зрабі рахунак сумлення. А можа і ты заздросціў, што ў твайго сябра або брата ёсць рэч, якую хочаш мець і ты? А ці ты не быў для кагосці прычынаю спакусы?